**Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў**

Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .3.

Частка 1. ДЗІЦЯЧАЕ МАЎЛЕННЕ: МЕХАНІЗМЫ І ЎМОВЫ АВАЛОДАННЯ РОДНАЙ І ДРУГОЙ МОВАМІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

РАЗДЗЕЛ 1. ПСІХАЛІНГВІСТЫЧНЫЯ ФАКТАРЫ МОЎНАГА НАВУЧАННЯ . . . 5

1.1.Маўленчая дзейнасць як аб’ект навучання ў дашкольным ўзросце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

1.2.Механізмы авалодання роднай і другой мовамі . . . . . . . . . .15

1.3.Развіццё маўлення дашкольніка як сродку камунікацыі . . .23

Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .32

РАЗДЗЕЛ 2. БІЛІНГВІЗМ У ДАШКОЛЬНЫМ УЗРОСЦЕ . . . .. . . . .33

2.1. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму . . . . .33

2.2 Праблемы ранняга двухмоўя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40

Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. . . . .53

Частка 2. КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ АСНОВЫ БЕЛАРУСКАМОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ ДАШКОЛЬНКАЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

РАЗДЗЕЛ 3. РОЛЯ І МЕСЦА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў СІСТЭМЕ ДАШКОЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ . . . . .. . . . . . . . . .55

3.1. Сацыялінгвістычная сітуацыя на Беларусі . . . . . . . . . . . 55

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3.2. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў .. 63
3.3. Псіхолага-педагагічныя перадумовы беларускамоўнага развіцця дашкольнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. . . . . . .74
Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

РАЗДЗЕЛ 4. ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МАДЭЛЬ НАВУЧАННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДЗЕ . .83
4.1. Стратэгія навучання дашкольнікаў беларускай мове . . . . . .83
4.2. Матывацыя маўлення дашкольнікаў на беларускай мове . . 95
4.3. Сістэматызацыя зместу маўленчай работы ў нацыянальным дзіцячым садзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. 108
Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. . . . . . . . . . . . . .114
Частка 3. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ . . . . . . . . . . . . .115

РАЗДЗЕЛ 5. ШЛЯХІ РЭАЛІЗАЦЫІ КАМУНІКАТЫЎНАГА НАПРАМКУ Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ 115
5.1. Развіццё ў дзяцей пачуццёвай асновы беларускага маўлення 115
5.2. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў у спантанных зносінах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
5.3. Арганізацыя беларускамоўных зносін дзяцей на спецыяльных занятках . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .139

РАЗДЗЕЛ 6. ФАРМІРАВАННЕ ПРАКТЫЧНЫХ МАЎЛЕНЧЫХ НАВЫКАЎ . . . 139
6.1 Развіццё беларускага слоўніка дзяцей . . . . . . . . . . . . . . . . . . .139

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6.1.1. Значэнне слоўнікавай работы (139). 6.1.2. Адбор лексічнага матэрыялу (143). 6.1.3. Асаблівасці методыкі слоўнікавай работы (164)

Бібліяграфія .. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .169

6.2. Фарміраванне граматычнага ладу маўлення . . . . . . . . . . . 171

6.2.1. Адбор граматычнага матэрыялу (171). 6.2.02. Паслядоўнасць навучання дашкольнікаў асаблівасцям беларускай граматыкі (175). Фарміраванне граматычных навыкаў (180)

Бібліяграфія. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203

6.3. Фарміраванне навыкаў вымаўлення . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

6.3.1. Адбор і паслядоўнасць увядзення фанемных адзінак (204). 6.3.2.Фарміраванне правільнага вымаўлення спецыфічна беларускіх гукаў (210). 6.3.3. Работа над беларускай арфаэпіяй (217).

Бібліяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223

6.4. Развіццё прадуктыўнага маўлення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .223

6.4.1. Асноўныя прынцыпы фарміравання дыялагічнага і маналагічнага маўлення (223). 6.4.2. Развіццё вобразнасці маўлення ў старэйшых дашкольнікаў (234).

Бібліяграфія . . . . . . .. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .237

Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238

Рэкамендаваная літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .242

ДАДАТКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# П Р А Д М О В А

У роднай мове выражаюцца і замацоўваюцца змест культуры народа, уласцівыя яму ідэалы і каштоўнасці, спосабы мыслення і ўзаемадзеяння, маральныя нормы і гістарычны вопыт. Па словах рускага педагога К.Дз.Ушынскага, «увесь след свайго духоўнага жыцця народ клапат-ліва захоўвае ў родным слове» (Ушинский 1974, 147), менавіта таму родная мова – гэта вялікі настаўнік для дзіцяці. Тую ж думку праводзіў бела-рускі народны паэт і педагог Я.Колас, які неаднаразова падкрэсліваў, што “родная мова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет” (Колас 1976, 26).

Навучанне дзяцей нацыянальнай мове ў Беларусі ажыццяўляецца ў спецыфічнай сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага двухмоўя. Для большасці дашкольнікаў першай мовай, якую яны чуюць ад дарослых, на якой вучацца размаўляць і мысліць, мець зносіны з акружаючымі людзьмі, з’яўляецца руская мова. Беларуская мова, да якой дзеці далучаюцца пазней, выступае для іх як другая.

У той жа час беларуская мова для беларускіх дзяцей з’яўляецца роднай мовай, паколькі менавіта яна адлюстроўвае гісторыю, традыцыі беларускага народа, уводзіць у народную паэзію, народныя вераванні, філасофію, тлумачыць прыроду. У наяўнасці ўнікальная сітуацыя, калі другая мова з’яўляецца для чалавека “мовай душы”, а не толькі памяці. Адсюль вынікае складаная праблема навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове як другой, але роднай, далучэнне іх да духоўных каштоўнасцей свайго народа, фарміраванне ў іх пачуцця нацыянальнай годнасці.

Прызначэнне кнігі – пазнаёміць студэнтаў, якія вывучаюць методыку развіцця маўлення дзяцей у дашкольных установах, з тэарэтычнымі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

метадычнымі асновамі фарміравання ў дашкольнікаў з рускамоўных сем'яў маўленчай дзейнасці на беларускай мове. Работа не замяняе падручнік па методыцы, а выступае як дапаможнік па адпаведным спецкурсе. Таму ён разлічаны на пэўную пачатковую падрыхтоўку студэнтаў па методыцы, лінгвістыцы і дзіцячай псіхалогіі.

Дапаможнік можа быць выкарыстаны і выхавальнікамі дашкольных устаноў, якім ён, на нашу думку, дапаможа ў складанай працы па маўленчым выхаванні і лінгвістычным развіцці дзяцей у нашай няпростай сацыялінгвістычнай сітуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Сучасную сацыялінгвістычную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь можна ахарактэрызаваць як блізкароднаснае руска-беларускае двухмоўе. Жыццёвай неабходнасці карыстацца беларускай мовай у рускамоўных дашкольнікаў няма, што тлумачыцца адсутнасцю паўнацэннага беларускамоўнага асяроддзя. Аднак у дзяцей узнікаюць "жыццёвыя" ўяўленні аб рускай і беларускай мовах, развіваецца рэцэптыўнае і ў пэўнай ступені рэпрадуктыўнае двухмоўе. Пры традыцыйным навучанні дзвюм мовам шляхам прад'яўлення ўзору правільнага маўлення ў дзяцей развіваецца сумешчаны механізм стварэння тэкстаў на гэтых мовах. Авалодаць правільным маўленнем на беларускай мове рускамоўныя дашкольнікі могуць толькі ў ходзе спецыяльна арганізаванага навучання.

Беларуская мова для беларускіх дзяцей асэнсоўваецца ў грамадстве як родная мова. Зыходзячы з гэтага, галоўная мэта наву-чання дашкольнікаў беларускай мове вызначаецца як развіццё асобы кожнага дзіцяці, узбагачэнне яго духоўнага свету, выхаванне ў дзяцей прыязных адносін да беларускай мовы як да роднай. Другая мэта – развіццё моўнай здольнасці дзяцей. Далучаць да беларускай мовы як да роднай шляхам акультурацыі – увядзення ў нацыянальна-культурны фон гэтай мовы неабходна як мага раней, з моманту наведвання дзіцем дашкольнай установы, пры строгім захаванні прынцыпу "адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова" Часовае змешванне моў – зака-намерная з'ява, якая з цягам часу змяняецца размежаваннем моў, "асаблівай сферай дастасавання" для кожнай. Паралелізм засваення дзвюх моў – рускай і беларускай – з некаторым адставаннем беларускай прыводзіць да фарміравання двухмоўнай асобы.

Аднак уключаць беларускую мову ў зносіны з дзіцем з рускамоўнай сям'і трэба паступова, пачынаючы з азнаямлення іх з лепшымі ўзорамі дзіцячых мастацкіх твораў. Гэта дазваляе далучыць малых да багаццяў роднай мовы на ўзроўні мастацтва, садзейнічае развіццю ў іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першапачатковай пачуццёвай асновы беларускага маўлення, што з'яўляецца неабходнай умовай паўнацэннага засваення мовы як роднай.

Агульная стратэгія развіцця беларускага маўлення і навучання дашкольнікаў беларускай мове як роднай будуецца, па-першае, як адносна стыхійнае і ў пэўнай меры ўпарадкаванае авалоданне дзецьмі маўленчымі навыкамі ў працэсе штодзённых зносін, развіццё "беларускамоўнага чуцця" ў выніку паступовага "паглыблення" ў адпаведнае камунікатыўнае асяроддзе і прыстасавання да яго. Пры гэ-тым неабходна забяспечваць і ўтоенае засваенне таго або іншага ме-тадычна ўпарадкаванага моўнага матэрыялу. Такім шляхам засваенне мовы адбываецца ў працэсе спантаннай маўленчай дзейнасці.

Па-другое, развіццё беларускага маўлення будуецца як арганізаванае навучанне метадычна нармаваным моўным сродкам у працэсе вучэбна-маўленчай дзейнасці дзяцей.Тут загадзя акрэслены аб'ём лексічнага, граматычнага, фанетычнага матэрыялу, паслядоўнасць яго падачы абумоўліваюць выбар метадычных прыёмаў навучання.

У працэс навучання беларускай мове ўключаецца і мастацка-маўленчая дзейнасць, якая можа быць як спантаннай, так і вучэбнай. У выніку мастацкая мова становіцца здабыткам самога дзіцяці.

Засваенне мовы у працэсе спантаннай, вучэбна-маўленчай і мастацка-маўленчай дзейнасці з'яўляецца для дзяцей адносна неадвольным, неўсвядомленым працэсам. (Пэўнаму асэнсаванню садзейнічае параўнанне беларускіх і рускіх моўных з'яў.) Каб старэйшыя дашкольнікі маглі ў пэўнай ступені асэнсаваць асаблівасці беларускай мовы, арганізуецца іх моўна-пазнавальная дзейнасць, у выніку якой яны засвойваюць пэўныя агульналінгвістычныя тэрміны, у іх фар-міруецца больш глыбокае ўсведамленне з'яў беларускай і рускай моў.

Развіццё беларускага маўлення і навучанне беларускай мове неабходна будаваць у адпаведнасці з агульнымі заканамернасцямі авалодання мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вядучым у навучанні з’яўляецца фарміраванне ў дзяцей абагульненых спосабаў пабудовы выказвання на беларускай мове. Гэта тым больш важна, што дзеці не атрымліваюць якаснага ўзо-ру беларускага маўлення ў тым аб’ёме, які неабходны для спантаннага развіцця адпаведнай моўнай здольнасці. Неадвольнае засваенне беларускага маўлення неабходна спалучаць з фарміраваннем у дашкольнікаў элементарнага ўсведамлення з’яў беларускай мовы.

Паступовае развіццё элементарных, “ніжэйшых” уласцівасцей беларускага маўлення трэба пачынаць з ранняга ўзросту, калі ў асноўным дзейнічае механізм імітацыі і толькі пачынае складвацца механізм аналогіі. Гэтую работу неабходна праводзіць і далей, пашыраючы яе на працягу ўсяго дашкольнага дзяцінства.

Фарміраванне ў дзіцяці элементарнага ўсведамлення моўных з’яў трэба ажыццяўляць з сярэдняга дашкольнага ўзросту – у момант найбольш вострага “моўнага чуцця”, што з’яўляецца найбольш эфектыўным сродкам для авалодання гэтай рэчаіснасцю. Пры такім падыходзе да навучання ёсць магчымасць спалучаць рысы адначасовага ранняга засваення дзвюх моў, калі руская і беларуская мовы выкарыстоўваюцца ў розных акалічнасцях, і паслядоўнага авалодання дзвюма мовамі, якое абапіраецца на метамоўныя ўменні дзіцяці. Падобнае спалучэнне дазваляе сфарміраваць у выхаванцаў дзіцячага сада “моўнае чуццё”, паўныя навыкі зносін на беларускай мове, і ў той жа час асэнсаваныя адносіны да яе.

Універсальным матывам маўленчай дзейнасці дашкольнікаў на другой мове з’яўляецца камунікатыўная гульня. Пры гэтым пэўную сферу зносін замацоўвае для кожнай з моў прынцып “новая мова – новая гульня”. Асабліва строга гэтага прынцыпу неабходна прытрым-лівацца ў дзіцячым садзе з рускім моўным рэжымам. Важнае месца ў гульнявой дзейнасці дзяцей займае беларуская народная гульня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акрамя таго, рэцэптыўны характар двухмоўя дазваляе пры развіцці разумення беларускага маўлення і актыўнага маўлення дзяцей абапірацца на патрэбу малодшых дашкольнікаў у зносінах з беларускамоўным выхавальнікам для выражэння станоўчых эмоцый. Матывацыйным фактарам маўленчай дзейнасці на беларускай мове для дзяцей сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту выступае патрэба ў атрыманні новай інфармацыі. У абодвух выпадках вырашальную ролю адыгрывае духоўная агульнасць выхавальніка і дзіцяці. Для старэйшых дашкольнікаў сацыяльна матываванай з'яўляецца беларус-камоўная маўленчая дзейнасць у якасці ўзору для малодшых дзяцей.

Адбор беларускамоўнага матэрыялу для засваення дзецьмі дашкольнага ўзросту вызначаецца, як заўсёды пры навучанні другой мове, прынцыпам практычнай неабходнасці, а таксама лёгкасцю ці цяжкасцю засваення. Акрамя таго, важным крытэрыям адбору моўнага матэрыялу, у першую чаргу лексікі і сінтаксісу, выступае адпаведнасць нацыянальным моўным традыцыям, што садзейнічае фарміраванню ў дашкольнікаў уласна-нацыянальнага светапогляду.

Методыка навучання дашкольнікаў беларускай мове спалучае рысы методыкі роднай мовы і другой мовы. З дапамогай першай ўводзяцца моўныя з'явы, якія супадаюць у беларускай і рускай мовах. Гэта асабліва датычыцца развіцця беларускага лексічнага запасу і вымаўленчых навыкаў. Чым больш адрозніваюцца беларуская і руская тэматычная лексіка, фанетыка, граматыка, тым з большай падставай выкарыстоўваецца методыка навучання дзяцей другой мове, у аснове якой (методыкі) ляжыць камунікатыўны падыход. Пры гэтым рэцэптыўны і рэпрадуктыўны характар блізкароднаснага двухмоўя дазваляе шырока выкарыстоўваць у працэсе навучання беларуска-моўны займальны матэрыял (вершы, загадкі, выслоўі і да т.п.), элементы беларускіх народных гульняў, гутаркі на беларускай мове,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што набліжае прыёмы навучання другой мове да прыёмаў навучання роднай мове.

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

Андреева Е.Г. О некоторых особенностях развития речи детей в условиях двуязычия (из опыта работы дошкольных учреждений БССР) //Дошкол.восп.- 1978.- № 7.- С.28-33.

Богуш А.М. Методика обучения русскому языку в дошкольных учреждениях – Киев, 1990.

Зимняя И.А. Психологические основы формирования двуязычия //Русский язык в национальной школе. – 1984, № 3. – С. 27-29.

Зимняя И.А Психологические аспекты обучения говорению на иностранном языке. – М., 1978.

Имедадзе Н.В. Управление процессом овладения вторым языком //Хрестоматия по возрастной и педагогической психологии /под ред. И.И.Ильясова, В.Я.Ляудис. М., 1981. – С. 235-239.

Кривицкий А.А., Михневич А.Е., Подлужный А.И. Белорусский язык для говорящих по-русски. -- Мн., 1990.

Леонтьев А.А. Основы психолингвистики. – М., 1997.

Негневицкая Е.И., Шахнарович А.М. Язык и дети. – М., 1981.

Савельева Т.М. Тэарэтычныя праблемы білінгвізму. //Адукацыя і выхаванне. – 1995. - № 10. – С. 49-52.

Савельева Т.М. Спецыфіка беларуска-рускага двухмоўя ў малодшых школьнікаў Рэспублікі беларусь // Адукацыя і выхаванне. – 1995. - № 12. – С. 43-46.

Сохин Ф.А., Негневицкая Е.И. Обучение русскому языку в национальном детском саду (психолого-педагогические проблемы) // Дошкол. восп. – 1984 - № 3. – С.30-36.

Старжынская НС. Беларуская мова ў дзіцячым садзе. – Мн., 1995.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Супрун А.Е. Содержание обучения русскому языку в белорусской школе. Мн., 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ